✓**6 лютага** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася **мастацкая выстаўка «Паэтычная палітра Фёдара Ястраба»**, прысвечаная памяці і 65-годдзю з дня нараджэння мастака і паэта. Пазнаёміцца з яго асобай бліжэй дапаможа кніжна-ілюстрацыйная выстаўка «Захавальнік сонца». Кнігі, альбомы, каталогі выставак і праектаў, часопісы і копіі артыкулаў адлюстроўваюць шматграннасць та-

ленту Ф. Ястраба як мастака, паэта, галерыста і настаўніка.

Фёдар (Франц) Адамавіч Ястраб (1953 – 2014) нарадзіўся ў в. Станіслаўцы Докшыцкага раёна, скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. З'яўляўся сябрам Беларускага саюза мастакоў, старшынёй Міжнароднай гільдыі жывапісцаў, дацэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, першым загадчыкам аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.